V Дыяцэзіяльны дзень дзіцяці

Аўтар: кс. Юрый Марціновіч
03.05.2015 01:00



"Хачу быць місіянерам радасці" Запрашаем дзяцей нашай дыяцэзіі ў "КРАІНУ РАДАСЦІ"

1 чэрвеня 2015 года

З
вялікай радасцю прагнем паведаміць, што 1 чэрвеня бягучага года ў Гродне (пар. Беззаганнага Зачацця НПМ, мікрараён Паўднёвы) адбудзецца V Дыяцэзіяльны дзень дзіцяці. Хочам з гэтым запрашэннем дайсці да кожнага дзіцяці нашай дыяцэзіі індывідуальна.

Дарагі малады Сябар, адчувай сябе ўжо цяпер запрошаным да ўдзелу ў гэтым свяце. Прыедзь у “Краіну радасці”, каб перажыць сапраўдную хрысціянскую радасць і вярнуцца дамоў і ў школу як ужо новы чалавек, з усмешкай на твары. † Дэвіз сёлетняга Дыяцэзіяльнага дня дзіцяці – “Хачу быць місіянерам радасці!” – няхай паўсюдна гучыць у гэты дзень сустрэчы з Богам і з Тваімі равеснікамі. Мы ўжо сёння гарантуем Табе цэлы набор цікавінак у апостальскім духу: малітва, Эўхарыстыя пад кіраўніцтвам ксяндза біскупа, забавы, музыка, гульні, конкурсы, а таксама тэатральныя інсцэніроўкі і прыемны сюрпрыз на заканчэнне.

На ўжо традыцыйны Дзень дзіцяці запрашаем першакамунійных дзяцей. Няхай гэтая сустрэча будзе для Вас падзякай за дар Эўхарыстыі. Падзяліцеся сваёй радасцю з іншымі!

Запрашаем на гэтую сустрэчу таксама Літургічную службу алтара – міністрантаў. Ваяры Пана, мы чакаем Вас!

Дарагія Дзеці разам з Катэхетамі і Бацькамі! Мы разлічваем на Вашу прысутнасць. З радасцю прыміце запрашэнне! Заахвочваем таксама да супрацоўніцтва ў арганізацыі гэтай нашай цудоўнай справы. Дзеці маюць магчымасць паказаць свае музычныя, тэатральныя, мастацкія здольнасці і да т.п. Дастаткова патэлефанаваць, прапанаваць і падаць заяўку аб удзеле, выступленні, выказаць прапанову і жаданне да супрацоўніцтва.

Ага! У нас ёсць яшчэ адна просьба да Цябе, наш дарагі Сябар. Памаліся аб добрым надвор’і, каб Бог падарыў нам прыгожае сонейка.

Прыблізная праграма сустрэчы:

- **Ад 9.00** – прыезд дзяцей і сняданак;

10.30	– урачыстае адкрыццё юбілейнага V Дыяцэзіяльнаг
14.00	– абед;
Каля 16.00	– св. Імша пад кіраўніцтвам ксяндза біскупа;
18.00	– разасланне малых місіянераў у свет. Заканчэнне.

Больш падрабязная праграма будзе пададзена трохі пазней.

Кантакты для супрацоўніцтва:
e-mail: **sakralna@op.p**l;
(8-044)46-06-140 (Velcom), (8-029)78-40-572 (MTS).